■ Сацыяльны клопат

# ДЗЯРЖАВА КАМПЕНСУЕ

## ІНВАЛІДАМ, ЯКІЯ САМАСТОЙНА НАБЫВАЮЦЬ СРОДКІ РЭАБІЛІТАЦЫІ, БУДУЦЬ ВЯРТАЦЬ ГРОШЫ

**Адпаведны праект пастановы падрыхтаваны і цяпер узгадняецца. Мяркуецца, што дакумент пачне дзейнічаць у наступным годзе. Згодна з ім, інвалідам будуць кампенсаваць з бюджэту суму, выдаткаваную імі на сродкі рэабілітацыі. Гэта тычыцца дыктафонаў, плэераў, тэлефонаў са спецыяльнымі праграмамі, прыстасаванняў для апранання, захопу прадметаў, супрацьпролежневых падушак і матрацаў і іншых неабходных рэчаў. Таксама прадугледжваецца пашырыць Дзяржаўны рэестр тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, якія выдаюцца інвалідам бясплатна ці на льготных умовах. У гэты пералік уключаць яшчэ 11 пазіцый.**

Сёння ў краіне налічваецца 545,5 тысячы інвалідаў (амаль шэсць працэнтаў ад усяго насельніцтва). Забяспячэнне сродкамі рэабілітацыі — толькі адна з ільгот, што дзейнічаюць для гэтай катэгорыі. Напрыклад, каб дапамагчы людзям з асаблівасцямі ўладкавацца на працу, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўстанаўліваюць браню. Сёлета для інвалідаў забраніравалі больш за дзве тысячы месцаў. За дзесяць месяцаў бягучага года на гэтыя вакансіі ўладкаваліся 544 чалавекі. Яшчэ васямнаццаці выдалі субсідыі на адкрыццё сваёй справы. З пачатку года заключаны дагаворы з пяццю наймальнікамі аб кампенсацыі і фінансаванні выдаткаў на стварэнне 26 месцаў для інвалідаў. На гэтыя сродкі з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва пайшло 8 мільярдаў рублёў. Інваліды I і II групы маюць права на скарочаны працоўны тыдзень (не больш за 35 гадзін). Пры гэтым наймальнік абавязаны налічваць ім заработную плату ў поўным памеры.

— Бацькі, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, атрымліваюць павялічаныя выплаты, — адзначае намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК. — Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да трох гадоў (сёння яна раўняецца 3,1 мільёна) складае 45 працэнтаў ад сярэднямесячнага заробку па рэспубліцы за квартал. Гэта на дзесяць працэнтаў больш за выплаты на першае дзіця, і на пяць — за дапамогу на другога і наступных.

Ільготы для інвалідаў прадугледжвае і сістэма адукацыі. Маладыя людзі з асаблівасцямі могуць разлічваць на сацыяльную стыпендыю, вучыцца ў групах з меншай напаўняльнасцю. Праўда, колькасць студэнтаў ВНУ з інваліднасцю застаецца невялікай. Па словах начальніка аддзела спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Антаніны ЗМУШКО, цяпер ва ўніверсітэтах вучыцца каля 1,2 тысячы такой моладзі. Найбольш студэнтаў з асаблівасцямі займаецца ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце (216 чалавек).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## СТРУКТУРА ПРЫЧЫН ІНВАЛІДНАСЦІ ДАРОСЛАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

ў 2014 годзе (звесткі прадастаўлены Белстатам)




■ Пераадоленне

# Я САМ ТАКІ,

## або Дзякуй траўме за атрыманую мудрасць

**Мець статус інваліда — нагода хутчэй для смутку, чым для гонару. Гэтыя людзі жывуць побач з намі, але мы імкнёмся іх не заўважаць. Яны жывуць у асаблівым свеце, пра існаванне якога часам не здагадваюцца нават блізкія...**

Яны могуць быць невераголна таленавітымі і душэўна багатымі людзьмі, але грамадства зацята імкнецца адрынуць тых, хто не ўпісваецца ў «пракрустаў ложак» усеагульнай падобнасці.

Мне 66 гадоў, я стаў інвалідам першай групы пажыццёва пасля таго, як няўдала нырнуў і атрымаў цяжкую траўму пазваночніка. Я паспрабую асэнсаваць паняцце «інваліднасць», па-свойму «ўзважыць» гэта лёсавызначальнае слова ў дачыненні да сябе.

Інваліднасць — гэта, хутчэй за ўсё, лёс. Яна для мяне стала выпрабаваннем, навучыла памяркоўнасці, а яшчэ — думаць і прымаць свет такім, які ён ёсць. Дзякаваць Богу за кожную пражытую хвіліну ў гэтым свеце. Інваліднасць — гэта магчымасць пераасэнсавання і змяніць да лепшага сваё жыццё. Даказаць, што я не горшы за іншых, а ў нечым нават пераўзыходжу паўнавартасных людзей па мэтанакіраванасці, сіле волі, духу, талентам, дадзеным ад Бога. Калі б я быў здаровым чалавекам, наўрад ці хапіла б мне часу (менавіта часу) падумаць над тым, хто я і навошта нарадзіўся на гэты свет. Мітусня і бытавыя клопаты не дазваляюць гэтага зрабіць. А пасля атрымання траўмы пазваночніка з'явіўся час падумаць і зразумець, што сапраўды важна ў гэтым жыцці.

Інваліднасць — гэта барацьба. Але пасля доўгай барацьбы прыходзіць пакора. Не, я не склаў рукі. Зразумей: хопіць жыць з думкай, што калі-небудзь вярнуся да мінулага. Хоць адна з галоўных праблем, з якой сутыкаецца чалавек, атрымаўшы цяжкую траўму, — шкадаванне аб страчаным. Гэтыя думкі трэба адкінуць імгненна. Трэба займацца сабой і паралельна прыстасоўвацца, браць ад жыцця максімум і ўсімі сіламі імкнуцца быць карысным іншым людзям.

Інваліднасць — не толькі дадатковая нагрузка, але і стымул да творчасці. Калі б не яна, я не займаўся б тым, чым займаюся цяпер: жывапісам (больш 800 прац), напісаннем нарысаў і апавесцяў, удзелам у краязнаўчых віктарынах і конкурсах, у тым ліку ў літаратурных конкурсах (намінацыя «Проза»). Як вынік — мноства дыпломаў і грамат. Супрацоўнічаю з раённай, абласнымі і рэспубліканскімі газетамі. У 2010 годзе выйшла мая кніга «Споведзь чалавека ў інвалідной калясцы». Дзякуй траўме за жыццёвую мудрасць! Дзякуй за тое, што дапамагла рэалізаваць сябе на асабліва складаных адрэзках лёсу. Маёй траўме 35 гадоў, і вельмі цяжка сказаць, кім бы я гэты час мог быць, калі б не інваліднасць. Можа, спіўся б на будоўлях і адышоў у іншы свет, як здарылася са шматлікімі маімі знаёмымі, з якімі працаваў раней?

Каб спраўляцца з бар'ерамі, трэба паставіць перад сабой пэўную мэту і ўпэўнена да яе імкнуцца. Галоўны бар'ер — гэта наш страх і наша лянота. Як змагацца? Рабіць тое, чаго баішся, і кожны дзень, кожную гадзіну, кожную хвіліну пераадольваць сваю ляноту. Гэта аснова поспеху. Я ведаю. Сам такі.

Слова «інвалід» не лічу абразлівым. Хоць трэба глядзець, у якім кантэксце яно гаворыцца. Я ж аддаю перавагу выразу «чалавек з інваліднасцю», таму што галоўнае — гэта чалавек, а з чым ён, з інваліднасцю ці з роварам, гэта ўжо другаснае. У некаторых краінах інваліды — гэта «людзі з павышанымі запатрабаваннямі», у нас — гэта «людзі з абмежаванымі магчымасцямі». Адчуйце розніцу.

Дарэчы, мною напісана матэрыялаў не на адну кнігу, іх героі — інваліды. Калі ж перафразіраваць словы К. Сіманава, дык бядa ў тым, што гэтыя рукапісы — усяго толькі рукапісы, якім, па-мойму, варта стаць кнігамі. Пакуль гэта мая блакітная мара, якую, можа, хтосьці пачуе, і яна ажыццявіцца.

Божа, пазбаў нашы душы ад інваліднасці!

**Валерый ВАСІЛЕЎСКІ**

■ Без абмежаванняў

# АДНА « БАЗАВАЯ» — І ТЫ РАМЕСНІК

## Пасільная праца напаўняе жыццё сэнсам

**Я калекцыяную кававыя кубачкі
і адусюль, дзе бываю,
стараюся прывезці хаця б адзін.
Самы кранальны экспанат у маёй
калекцыі — кубачак са сподкам,
вылеплены і распісаны ўручную,
трохі крываваты, з далікатнымі
акварэльнымі кветкамі.
Ён вылучаецца нейкай цёплай,
безабаронняй прыгажосцю.
Я купіла яго ў сувенірнай краме
старога Таліна. Адразу ж, як убачыла
на паліцы, не змагла адвесці вачэй...
Аказалася, гэты кубачак зроблены
чалавекам з інваліднасцю,
а сувенірная крамка была сацыяльнай.**

Цяпер такія сацыяльныя крамы, дзе можна купіць вырабы людзей з абмежаванымі магчымасцямі, з'явіліся і ў Беларусі, напрыклад у Баранавічах. Але давайце па парадку...

Раней пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва меліся толькі сацыяльна-рэабілітацыйныя майстэрні для людзей з інваліднасцю. Выключна працоўных майстэрняў не было.

У чым розніца паміж сацыяльна-рэабілітацыйнымі і працоўнымі майстэрнямі? Першыя, па словах спецыялістаў, ставяць сваёй мэтай аднаўленне і развіццё парушаных функцый у людзей з інваліднасцю, фарміраванне кампенсаторных навыкаў па самаабслугоўванні, вядзенні хатняй гаспадаркі, навучанне элементарным працоўным аперацыям. Людзі ў такіх майстэрнях лепяць, вырабляюць сувенірную прадукцыю, але не прадаюць яе.

У працоўных майстэрнях людзі з інваліднасцю працуюць па тэрміновым працоўным дагаворы і ў адпаведнасці з рэкамендацыямі МРЭК. І за сваю працу атрымліваюць заработную плату, да таго ж ім ідзе працоўны стаж.

— Давайце будзем шчырымі: людзі з абмежаванымі магчымасцямі, якія маюць псіхафізічныя асаблівасці, сёння неканкурэнтаздольныя на рынку працы, — кажа **дырэктар ТЦСАН Баранавічаў Алена ГЕРМАН.** — Яны па стане здароўя не здольны на роўных канкураваць са здаровымі людзьмі. Як правіла, тыя, хто з дзяцінства атрымліваюць пенсію па інваліднасці. Памер яе без працоўнага стажу невысокі... Калі ж чалавек з абмежаванымі магчымасцямі зможа афіцыйна папрацаваць хоць бы некалькі гадоў, то яго пенсія павялічыцца і будзе ісці ўжо як рабочая.

У майстэрнях дзённага аддзялення ТЦСАН Баранавічаў адаптацыя інвалідаў да працоўнай дзейнасці ажыццяўляецца з 2008 года. Гэтая праца фінансуецца са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. У 2008 годзе пачала сваю працу майстэрня па вырабе простай друкаванай прадукцыі, у якой маладыя людзі асвоілі працэс вырабу брашур, часопісаў, запісных кніг, паштовак ручной працы. Для майстэрні былі набыты камп'ютар, капіравальны апарат, каляровы лазерны прынтар і інш. У 2010-м была створана майстэрня, дзе маладыя інваліды асвоілі працу са льном і льновалакном і навучыліся вырабляць сувеніры і пано. У 2012-м адкрылася майстэрня па вырабе папяровых пакетаў для падарункаў і канвертаў. Прадукцыя бязвыплатна перадаецца ў бюджэтныя арганізацыі.

Дарэчы, маладыя інваліды, якія працуюць у адной з такіх майстэрняў, атрымліваюць заработную плату. Яна складае 2 180 126 рублёў у месяц. Пасля заканчэння работ па адаптацыі да працоўнай дзейнасці ім пералічваюць пенсію па інваліднасці на працоўную.

Вось ужо другі год пры дзённым аддзяленні ТЦСАН працуюць дзве рамесніцкія майстэрні. Іх наведваюць 16 чалавек.

— Мы прапанавалі маладым людзям стаць рамеснікамі, — кажа Алена Герман. — Бо тыя навыкі, якім мы іх навучылі ў працоўных сацыяльна-рэабілітацыйных майстэрнях, падпадаюць пад рамесніцкую дзейнасць. Нашы падапечныя паспяхова прайшлі адаптацыю да працоўнай дзейнасці і зараз могуць самастойна працягваць працаваць па засвоенай прафесіі. Зарэгістравацца рамеснікам проста: дастаткова заплаціць адну базавую велічыню ў год — і ты можаш працаваць. Так у людзей з інваліднасцю з'яўляецца магчымасць рэалізоўваць сваю прадукцыю — на кірмашах і ў рамках дабрачынных акцый у школах горада... Мы імкнёмся аказваць ім у гэтым садзейнічанне. І ў нас гэта атрымліваецца. А ўжо як яны самі рады!

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.